УДК 378.14:81

# САЦЫЯЛЬНАЯ СЕТКА «ВКОНТАКТЕ» ЯК АДЗІН СА СПОСАБАЎ ФАРМІРАВАННЯ КАМПЕТЭНЦЫЙ БУДУЧЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

А. В. ШАРАПАВА
Беларуска-Расійскі ўніверсітэт
Магілёў, Беларусь

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета
http://e.biblio.bru.by/

У межах рэфармавання вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь важнае значэнне надаецца развіццю акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый[1] будучых спецыялістаў. «Аналіз тэорыі і практыкі адукацыі паказвае, што комплексна сфарміраваць у студэнтаў сучасныя кампетэнцыі толькі сродкамі лекцыйна-семінарскіх формаў заняткаў не з’яўляецца магчымым, паколькі пры гэтым пераважна засвойваецца «ў гатовым выглядзе» сістэма ведаў, уменняў, навыкаў як алгарытм вырашэння тыповых праблем. У той час як кампетэнцыі могуць эфектыўна развівацца ў студэнтаў толькі на аснове іх самастойнай пошукавай творчай дзейнасці, самастойна набытага вопыту вырашэння разнастайных задач» [1, с. 47]. Для фарміравання належных кампетэнцый важнае значэнне набывае ўзаемадзеянне розных формаў і метадаў навучання ў працэсе засваення вучэбных дысцыплін «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», «Беларуская мова (культура мовы)». Аўдыторная форма навучання рэалізуецца на штотыднёвых занятках першакурснікаў у I (I і II) семестры. Пазааўдыторная работа актыўна выкарыстоўвае магчымасці інтэрнэту, у тым ліку і сацыяльныя сеткі. Сацыяльная сетка – гэта рэсурс, прызначаны для зносін у інтэрнэце паміж людзьмі ці арганізацыямі, якія пры гэтым часта аб’яднаны па ўзроставым, сацыяльным, адукацыйным прынцыпе, што дае большыя магчымасці для актыўнай камунікацыі. Адна з папулярных сетак у вучнёўскім, студэнцкім асяроддзі Беларусі – сетка «ВКонтакте» (vk.com), што арыентавана найперш на моладзь, мае добрыя мультымедыйныя магчымасці. Практычна ўсе студэнты-першакурснікі маюць зарэгістраваныя акаўнты (профілі). Для зносін педагога з навучэнцамі мэтазгодна выкарыстоўваць такі від сеткавай супольнасці, як група (суполка). У 2016 г. для інфармавання і каардынацыі дзеянняў студэнтаў была створана група з агульнай назвай «Беларуская, руская і замежныя мовы».

Менавіта дзякуючы названай суполцы ажыццяўляецца інфармаванне навучэнцаў, мадэрацыя разнастайных мерапрыемстваў, папулярызацыя

[1]«Кампетэнцыя ўключае сукупнасць узаемазвязаных якасцей асобы (ведаў, уменняў, навыкаў, спосабаў дзейнасці), зададзеных у адносінах да пэўнага кола прадметаў і працэсаў і неабходных для якаснай прадуктыўнай дзейнасці ў дачыненні да іх; кампетэнтнасць – валоданне чалавекам адпаведнай кампетэнцыяй, у якую ўваходзіць яго асабістае стаўленне да яе і прадмету дзейнасці» [2].

беларускай мовы і культуры. Адной з формаў работы ў кантэксце фарміравання кампетэнцый будучых спецыялістаў з'яўляецца арганізацыя літаратурных тыдняў, што прысвечаны юбілеям беларускіх пісьменнікаў[1].

Праграмы Тыдняў прадугледжваюць як традыцыйныя – конкурс насценнага друку, правядзенне віктарыны, прысвечанай жыццю і творчасці пісьменніка, спаборніцтва чытальнікаў мастацкіх твораў аўтара, так і не зусім характэрныя для студэнтаў нефілалагічнага профілю мерапрыемствы – конкурс на лепшую відэапрэзентацыю твора пісьменніка ў сацыяльнай сетцы, флэшмоб, які пэўным чынам звязаны з пісьменнікам. Відэаролікі, а таксама фота- і відэасправаздачы Тыдняў можна пабачыць у суполцы: #мойбагдановіч, #нашыкласікі, #Яўгенія_Янішчыц.

Напрыклад, у гэтым навучальным годзе цікава прайшоў флэшмоб #Яўгенія_Янішчыц. У 2017 г. у Магілёве выпускнікамі Школы гарадскіх ініцыятыў «Цяпліца» быў здзейснены праект «Вершы на сценах»: сем вершаў і малюнкі да іх былі размешчаны на сценах будынкаў горада. Адзін з вершаў – славуты твор Яўгеніі Янішчыц «Ты пакліч мяне, пазаві ...». Студэнты атрымалі заданне: знайсці арт-аб'ект, сфатаграфавацца на яго фоне, зрабіўшы гэта арыгінальна і творча, размясціць фота ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» #Яўгенія_Янішчыц, даць каментарыі да яго. Шляхам падліку падабаек і рэпостаў было вызначана і ўхвалена лепшае фота.

Падобнага кшталту мерапрыемствы спрыяюць фарміраванню патрыятычных пачуццяў у будучых спецыялістаў як эліты беларускай інтэлігенцыі, што з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў беларускай ідэалогіі. Выкарыстанне сацыяльных сетак дазваляе стварыць адукацыйную прастору, якая забяспечвае эфектыўныя зносіны паміж навучэнцамі і выкладчыкамі, актывізуе пазнавальную дзейнасць студэнтаў, стымулюе развіццё іх творчых здольнасцей, што спрыяе плённаму засваенню названых вышэй вучэбных дысцыплін, актуалізуе набытыя кампетэнцыі і спрыяе фарміраванню новых.

## СПІСАК ЛІТАРАТУРЫ


1. **Макаров, А. В.** Компетентностно-ориентированные учебные программы нового поколения : аналитический обзор / А. В. Макаров // Выш. шк. – 2010. – № 6. – С. 47–52.

2. **Хуторской, А. В.** Определение общепредметного содержания и ключевых компетенций как характеристика нового подхода к конструированию образовательных стандартов [Электронный ресурс] / А. В. Хуторской. – Режим доступа: http://www.eidos.ru/journal/2002/0423.htm. – Дата доступа: 14.01.2019.


[1] Прыкладам рэалізацыі работы такога кшталту могуць быць Тыдні, прысвечаныя 125-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча (2016 г.), 135-годдзю Я. Купалы і Я. Коласа (2017 г.), 70-годдзю Я. Янішчыц (2018 г.), што прайшлі на кафедры «Беларуская, руская і замежныя мовы», з 2017 г. «Гуманітарныя дысцыпліны».



Электронная библиотека Белорусско-Российского университета
http://e.biblio.bru.by/